HEINRICH BÖLL STIFTUNG

Я захапляюся мужнасцю і рашучасцю лаўрэатак

Вітальнае слова. Мы павінны разам бараніць фемінізм, роўнасць і дэмакратыю, патрабуе Ліза Пауз, дэпутатка Бундэстага, федэральная міністарка па справах сям'і, сталых людзей, жанчын і моладзі.

**Дарагая Імэ Шольц,**
**дарагі Ян Філіп Альбрэхт,**
**дарагія прадстаўніцы і прадстаўнікі Фонду імя Генрыха Бёля,**
**дарагая Барбара Бінэк,**
**дарагое журы,**
**шаноўнае спадарства**
**– і ад усёй душы: дарагая Дар'я Афанасьева, дарагая Ірына Альхоўка, дарагая Юлія Міцкевіч!**

Для мяне па шчыраму вельмі важна быць сёння з Вамі! У такія часы, як гэтыя, калі ўсе, хто ў стане ўспрымаць сігналы гэтага часу, адчуваюць, што пастаўлена на карту. Мы павінны бараніць фемінізм, роўнасць і дэмакратыю: падмурак нашага існавання і наша палітычная місія.

Такія супольнасці, як гэтая тут, прыносяць бясконцую карысць
– таму што мы ўсе ведаем, за што трэба змагацца!
– кожная і кожны на сваім месцы!
– ва ўпэўненасці, што нас шмат і мы моцныя!

Сёння мы ўшаноўваем Дар'ю Афанасьеву, Ірыну Альхоўка і Юлію Міцкевіч!
Жанчыны, якімі я захапляюся за іх мужнасць і рашучасць!
За Ваш супраціў фальсіфікацыі выбараў і прыгнёту, супраць гандлю людзьмі і жанчынамі, супраць гвалту і сэксізму.

Яны робяць гэта ў выгнанні. Няспынна хвалюючыся за сваякоў і сяброў. Удалечыні ад сваёй радзімы Беларусі. І з пільным позіркам на Еўропу - на трывожную антыфеміністычную адваротную рэакцыю: калі абмяжоўваюцца рэпрадуктыўныя правы, феміністкія галасы дыскрымінуюцца, мэты роўнасці скарачаюцца, калі таксама ў Германіі правыя экстрэмісты распальваюць нянавісць да жанчын, расце сэксуальны гвалт і феміцыды.

Таму што ўсё гэта вынікае з аўтарытарнай логікі: хто абмяжоўвае свабоду жанчын, аслабляе дэмакратыю і згуртаванасць – аслабляе ўсё грамадства!

Таксама з гэтай нагоды мы сёння тут!
Таксама з гэтай нагоды мы не маўчым!

І мы звяртаем асаблівую ўвагу на сітуацыі, калі палітыкам і актывістам пагражаюць, пазбаўляюць іх правоў або забіваюць: наша салідарнасць з Вамі, дарагія лаўрэаткі прэміі, - гэта больш, чым проста словы:
Гэта абавязак для ўсіх нас.
Шчыры дзякуй.